# З'яднала спадчына Агінскага

***15 красавіка ў Сейме Літоўскай Рэспублікі адбылася Міжнародная канферэнцыя «Вялікія светачы культуры», прысвечаная Міжнароднаму дню культуры.***

У 1935 г. у Вашынгтоне 15 красавіка быў падпісаны Дагавор аб міжнародных нормах аховы культурных каштоўнасцяў (аўтарам ідэі і ініцыятарам выступіў рускі мастак, пісьменнік, філосаф і падарожнік Мікалай Рэрых, таму дакумент атрымаў назву Пакт Рэрыха). Гэта быў першы міжнародны дагавор аб абароне мастацкіх і навуковых устаноў і гістарычных помнікаў. 15 красавіка ў некаторых краінах адзначаецца як Міжнародны дзень культуры. У Літоўскай Рэспубліцы з 2006 г. гэта адбываецца на дзяржаўным узроўні. У гэты дзень па ўсёй краіне праходзяць канцэрты, спектаклі, творчыя сустрэчы, адкрываюцца выстаўкі, арганізоўваюцца канферэнцыі.

Для Літвы, як і для Беларусі, сёлетні год асаблівы: 250-годдзе з дня нараджэння кампазітара, грамадскага і палітычнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага, 140-годдзе жывапісца і кампазітара, аднаго з пачынальнікаў прафесійнай літоўскай музыкі Мікалоюса Чурлёніса, 80-годдзе з дня падпісання Пакта Рэрыха. Таксама 2015-ы абвешчаны ў Літве годам рэгіянальных культураў.

З нагоды гэтых знамянальных датаў і падзеяў і прайшла канферэнцыя «Вялікія светачы культуры». На пасяджэнні з дакладамі выступілі старшыня Сейма Ларэта Граўжынене, міністр культуры Літвы Шарунас Біруціс, рэктар Літоўскага універсітэта адукацыйных навук акадэмік Альгірдас Гайжуціс, дырэктар Рэтаўскага музея гісторыі культуры Агінскіх Вітас Руткаўскас, прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі «Мір праз культуру» Вілі Аўгустат (Аўстрыя), прэзідэнт Балтыйска-Турэцкай акадэміі культуры Ішак Акай (Турцыя) ды многія іншыя. На прэстыжным форуме аўтар гэтых радкоў прадстаўляў Беларусь, выступіў з дакладам «Магчымасці і перспектывы трансляцыі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі і Літвы з дапамогай трансгранічных кластараў» (ад імя Беларускага фонду культуры, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага»).



*Павел Сапоцька (Беларусь), доктар архітэктуры, прафесар Ёнас Глемза (Літва), старшыня Камітэта Знамя Міру Ауксе Нарвілене (Літва), Прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі «Мір праз культуру» Вілі Аўгустат (Аўстрыя), Прэзідэнт Балтыйска-Турэцкай акадэміі культуры Ішак Акай (Турцыя)*

У час канферэнцыі і наступных мерапрыемстваў вялікае значэнне было нададзена аспектам беларуска-літоўскага супрацоўніцтва: правядзенню Дзён культуры Беларусі ў Літве і Дзён культуры Літвы ў Беларусі, дзейнасці дыяспараў, навуковым праектам... Асаблівую ўвагу выклікалі праекты, рэалізаваныя з выкарыстаннем механізмаў знешняга фінансавання, такія, як «Выкарыстанне гістарычных сядзібаў і іх адаптацыя да сучасных культурных умоваў», дзякуючы якому ўдалося адрадзіць сядзібу роду Агінскіх у Залессі; «Віртуальнае мінулае – гарант поспеху будучыні музеяў» Кедайняйскага абласнога краязнаўчага музея, Музея культуры і гісторыі Латгаліі (Латвія), Рэзэкненскай вышэйшай школы (Латвія) і Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея (Беларусь); «Заахвочванне турызму па абодва бакі мяжы Беларусі і Літвы з мэтай павышэння дастунасці і прывабнасці культурна-гістарычнай спадчыны ў Рокішскім і Пастаўскім раёнах», дзе з дапамогай фінансавага рэсурсу рэстаўруецца унікальны помнік архітэктуры XIX ст. – палац Тызенгаўзаў у Паставах.

Шматлікія выбітныя дзеячы Літвы пакінулі след у культурнай прасторы Беларусі: вялікі акцёр тэатра і кіно Юозас Будрайціс, які зняўся ў беларускіх фільмах «Белыя Росы-2» і «Салодкае развітанне Веры»; фотамастак Альгімантас Александравічус, які прадставіў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі фотавыстаўку «Апошнія грамадзяне ВКЛ», прысвечаную паэтам Адаму Міцкевічу і Чэславу Мілашу; жывапісец, графік і выдавец Рымантас Дзіхавічус, адзін з найбольш шанаваных мастацтвазнаўцамі і калекцыянерамі аўтараў.

Заключнай падзеяй Дня культуры ў Вільні стаў літаратурна-музычны канцэрт у касцёле Святых Янаў, на якім выконваліся фартэпіянныя, арганныя і харавыя творы М. Чурлёніса. Імпрэза была арганізавана праўнукам творцы Рокасам Зубовасам, які нядаўна стаў дырэктарам Мемарыяльнай кватэры-музея свайго прадзеда – партнёрскай арганізацыі Мінскага абласнога аддзялення ГА «БФК».

***Міжнародны Дзень культуры ў літоўскай сталіцы сабраў і згуртаваў прадстаўнікоў некалькіх краінаў, якія працуюць на глебе культуры і спрыяюць яе адраджэнню і трансляцыі. Бо як пісаў сам М. Рэрых: «Культура ёсць шанаванне святла. Культура ёсць любоў да чалавека. Культура ёсць духмянасць, спалучэнне жыцця і прыгажосці. Культура ёсць сінтэз узнёслых і вытанчаных дасягненняў. Культура ёсць зброя свету. Культура ёсць выратаванне. Культура ёсць рухавік. Культура ёсць сэрца».***

*Павел САПОЦЬКА,*
*старшыня Мінскага абласнога аддзялення ГА «БФК»*



*Пад час канферэнцыі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ